РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ
Адміністрацыя
Першамайскага
раена
г. Мінска

РЕСПУБЛИКА БЕЛАРУСЬ
Администрация
Первомайского
района
г. Минска

220012 г. Минск, пер. К. Черного, 5

«25» 03 2021 г.

№ 12-4/776/1

Аб разглядзе звароту

На Ваш электронны зварот, накіраваны ў Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт, адміністрацыя Першамайскага раёна г.Мінска паведамляе.

На тэрыторыі Першамайскага раёна г.Мінска знаходзяцца жылыя дамы, якія аднесены да гісторыка-культурнай каштоўнасці Рэспублікі Беларусь і размешчаны па прасп. Незалежнасці №131/1, 143/1, 155/1 і вул. Каліноўскага 82/2.

Названыя дамы размешчаны на галоўным праспекце горада ў комплексе Нацыянальнай бібліятэкі і з'яўляюцца неад'емнай часткай архітэктурнага аблічча праспекта і горада Мінска. На тарцавой сцяне жылога дома № 155/1 па праспекце Незалежнасці размешчана мазаіка «Горад навукі». Згодна з ахоўным абавязацельствам па ахове матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей ад 10.08.2011 № 11-02-07/2101 ўласнік (КУП «ЖКГ Першамайскага раёна г. Мінска») абавязаны падтрымліваць гісторыка-культурную каштоўнасць у належным стане, забяспечваць доступ спецыялістам, якія з дазволу Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь маюць права на яе вывучэнне.

Пры візуальным аглядзе мазаічнага пано 19.03.2021 факты сапсавання мазаікі пры вытворчасці фасадных работ на паказаным жылым доме не пацвердзіліся, сляды фарбы на смальты адсутнічаюць.

У адпаведнасці з артыкулам 20 Закона Рэспублікі Беларусь ад 18.07.2011 № 300-З «Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асобаў" Вы маеце права абскардзіць рашэнне, прынятае па Вашым звароце, у вышэйстаячы дзяржаўны орган: Мінгарвыканкам.

Кіраўнік адміністрацыі Д.Т.Шашок

Забродская 281-63-26